MARK MILLAR • JOHN ROMITA JR.
KICK-ASS 3™
$2.99
ISSUE 2
.BY КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
Мардабой 3
№2 (2013)
пераклад
і афармленне:
Козыраў Сяргей
JR JR TP DW
THE BIG BAD!
ICON

KICK-ASS 3

ISSUE TWO

MARK MILLAR
WRITER AND COCREATOR

JOHN ROMITA JR.
PENCILS AND COCREATOR

TOM PALMER
INKS AND WASHES

DEAN WHITE
COLORS

CHRIS ELIOPOULOS
LETTERS

JENNIFER LEE
EDITOR

VARIANT COVER
DUNCAN FEGREDO
PENCILS AND INKS

PETER DOHERTY
COLORS

PREVIOUSLY:

Дэйв Лізеўскі заўсёды хацеў быць супергероем.
Цяпер ён узначальвае цэлую каманду супергерояў.

IDETTE WINECOOR: PRODUCTION

DAVID BOGART: SVP OF OPERATIONS & PROCUREMENT, PUBLISHING

KICK-ASS 3 No. 2. October 2013. Published Monthly by MARVEL WORLDWIDE, INC., a subsidiary of MARVEL ENTERTAINMENT, LLC. OFFICE OF PUBLICATION: 135 West 50th Street, New York, NY 10020.


ПАТРУЛЬ:
Дык і што вы, ідыёты, тут **робіце**?
Што ты нясеш?
Не рабіце з сябе нявінных. Што вы **нарабілі**? Абрабавалі кагосьці? Мабыць, залезлі ў нейчый дом?
Мы зараз абдзярэм цябе як ліпку. На што гэта яшчэ **падобна**?
А хто ахвяра?
Ён што, над намі здзекваецца?
Ты - ахвяра, ёлупень! Ці лічыш, супергероі недакранальныя?
Гані мабілу, боты і ўсю гатоўку, што ў цябе ёсць.
Што?
Паглядзіце на яго **пысу**. Маленькая сучка **ў шоку**...



Елдак вам у рот!
UNGH!
HGG!
FGG!
UNGH!


JESUS!
Няважна, колькі падцягванняў ты робіш кожную раніцу, **павучок**. Нікому не вытрымаць удар па яйцах...
UNGH!
Чысціце яго кішэні і валім.
Ты мне яйцы за гэта лізаць будзеш, сука...
Якога ляда?
Валім! Мы тут ужо скончылі!


Ты ў парадку? Моцна яны цябе?
Мне шкада. Ня варта было апушчаць левую руку... Ну як я мог так памыліцца?
За што ты просіш **прабачэння**? Табе няма за што прасіць прабачэння. Я працую медсястрой у шпіталі. Мне адвезці цябе ў **«хуткую»**?
Не, я ў парадку. Сапраўды. Мяне пару гадоў назад збіла машына. Таму я там, унізе, ужо практычна нічога не адчуваю.
Давай я цябе хоць куды-небудзь **давязу**? Ты ня можаш у такім стане ісці дадому сам.
Лайно! Яны забралі **гадзіннік** майго бацькі! Вось блін! Як яны так хутка знялі яго?
Паслухай, сядай у машыну і дай мне адвезці цябе! Мая змена ўжо скончылася, і я ўсё роўна еду дадому.
А вам не будзе цяжка гэта зрабіць?
Не, канешне. Гэта самае малае, што я магу зрабіць для таго, хто пазбаўляе нашыя вуліцы ад хуліганаў.
Вельмі смешна.


Ці **часта** такое здараецца?
Не. Ужо не. З тых часоў, як я пачаў займацца кожны ранак - такое стала адбывацца ўсё радзей.
Мяне вучылі ў суполцы паводзіць сябе як альфа-самец, каб запужаць супраціўнікаў. Ня ведаю, што пайшло ня так. Відаць, я проста **стаміўся**.
Вы ўсё яшчэ працуеце ў **камандзе**, як у мінулым годзе?
Так. Мы заляглі на дно на пару месяцаў, але, паверыш ці не, на **гэтых выхадных** мы плануем нешта неверагоднае.
Банды зноў вылазяць з падполля, усе паліцэйскія напагатове, а мы засумавалі па бойках.
Ходзяць чуткі, што ты патрулірыеш гэты раён. Ты цяпер **жывеш** у Джэрсі?
Эм, прабач, але я не збіраюся **адказваць** на гэтае пытанне.
У якім сэнсе?
Ну, не хачу, каб ты палічыла мяне **мудзілай**, але я захоўваю сваю таямніцу асобы ў сакрэце. У мінулым годзе здарылася шмат дрэннага, таму мне трэба быць **вельмі асцярожным**.



На самой справе, было б файна, калі б ты высадзіла мяне на тым скрыжаванні.
Чаму? Ты ж, здаецца, сказаў, што твой дом недзе ў кіламетры адсюль.
VERS
Так, але сёння чартоўскі прыемнае надвор'е, і я буду не супраць прайсці астатак дарогі пешшу. Гэта зойме ў мяне дзесяць мінут.
Ну добра, капітан параноя. Як тваёй душы будзе заўгодна.
Паслухай, я ведаю, абставіны цяжка назваць ідэальнымі, але для мяне было вялікім задавальненнем сустрэць свайго першага рэальнага супергероя. Мяне завуць Вэлеры, дарэчы.
Мардабой.
Я ведаю.
Беражы сябе, Мардабой.
Вы так сама, Вэлеры.
З дзённіка Энджы Джэнавезэ.


Ведаеце, што дрэннага ў тым, каб быць маткай суперзлодзея? Ты НІКОЛІ НЕ ВЕДАЕШ ДАСКАНАЛА. Прачынаючыся раніцай, ты ня ведаеш, які будзе твой дзень.
Калі быў Джоні, людзі проста ШАПТАЛІСЯ за маёй спінай. У выпадку з Крысам - людзі нават не баяцца зірнуць мне ў ВОЧЫ.
GRAND TAVERN
4 STAR LAUNDROMAT
Прывітанне, Энджы.
Эм, прывітанне.
Ты мяне ня памятаеш?
К-канешне, памятаю. Проста я **акуляры** дома пакінула.
Не, ня памятаеш, інач бы ты не **спынілася** б. Ведаеш, мой брат быў адным з тых, каго твой сын забіў у той разні, якую ён учыніў у мінулым годзе.
Цяпер у мяне няма брата, а ў **маіх** двух пляменнікаў - няма **бацькі**...
...усё з-за таго, што ты, шлёндра, вырасціла **антыхрыста**.


PTUI!
Падумай аб **гэтым**, гробаная курвіска.
Супакойся, мілая. Не марнуй свой час.
Прабачце. Я ніколі нават не **сустракала** гэтых людзей. Я...
Я змяніла тры адрасы і тры месца працы з тых часоў, як Крыса пасадзілі ў турму.
Але ўсё роўна знаходзіўся нейкі разявака на станцыі паліва ці ў супермаркеце, які памятаў мой твар, які друкавалі на першых старонках газет.
Мой псіхатэрапеўт сказаў, каб я ўехала падалей. Я ўжо пачала прыглядвацца да нерухомасці ў Маямі ці Сан Дыега.
Я ўжо марыла аб доме ў Вермонцец сярод дрэваў, дзе на шмат кіламетраў няма ні душы. Але я не магу ўвасобіць мару. Пакуль не магу. Пакуль Крыс яшчэ тут.
Мой доўг як маткі, клапаціцца аб тым, за што нясу адказнасць.



Добры дзень, Энджы.
Роко, прабач. Я ня ведала, што вы вырашылі сёння наведаць Крыса. Я магу прыйсці пазней, калі вы штосьці абмяркоўваеце.
Не хвалюйся. Мы не станем пазбаўляць маці часу спаткання з сынам. Я толькі зайшоў асабіста перадаць хлопчыку добрыя навіны.
Яго выпусцяць адсюль на гэтым тыдні, Энджы. Я ўсё яшчэ не магу паверыць у гэта, але Дон паклапаціўся аб **усім**.
Што? Як гэта наогул магчыма? Крыс жа забіў дзесяткі людзей. Былі **светкі**.
Яны бачылі толькі хлопца ў масцы. Адзін з нашых салдатаў возьмі віну на сябе і ім будзе нечага павесіць на Крыса.
На самой справе, наш адвакат сказаў, што мы можам нават прад'явіць ім пазоў за шэсць месяцаў **незаконнага турэмнага ўтрымання**.
О божа. Вы можаце гэта зрабіць?
Я - Роко Джэнавезэ, дарагая. Я магу зрабіць усё, што заўгодна... Асабліва, калі мне дапамагае **капітан** паліцыі і яго сябры.
Калі ты атрымаў **капітана**, Вік?
Пазаўчора. Начальнік сказаў, што за арышт **Забівашкі** я заслугоўваю чагосьці большага, а **лішнія грошы** мне не перашкодзяць.



Павінен згадзіцца, я ўражаны **аховай**, якую вы прызначылі тут, Джыгантэ. Як завуць гэтага мілага юнага хлопчыка?
Эм, гэта афіцэр Гэры Хэгарці, сэр. У яго ёсць жана і двое дзяцей. Таму сумняваюся, што ён будзе **зацікаўлены**.
Ну, калі ў яго ёсць жана і двое дзяцей, лічу, ён павінен быць **вельмі моцна** зацікаўлены...
Няхай ён прыйдзе да мяне **на вячэру** сёння ўвечары і апране **форму**. Гэта дадасць трохі **экзотыкі**.
Так, сэр.
Ну, наш горад нельга пакідаць без прыгляду, таму я лепш вярнуся да сваіх спраў...
...Чао, дзеткі. Пабачымся **ўвечары**, афіцэр Хэгарці.


Божа літасцівы, чаму ты **не сказаў** мне, што сёння да цябе прыйдзе твой дзядзька Роко?
Ды я, курвіска, сам ня ведаў! Я быў так сама напужаны, як і ты...
...і што ён нес за хрэнь наконт майго вызвалення? Ты чытала, што пра мяне пішуць у твітары? Ды мяне грохнуць адразу ж, як я з'яўлюся за парогам турмы!
Чаму нішто не даецца мне **лёгка**, мама? Чаму маё жыццё такое **жудаснае і заблытанае**?
Ён ные і ные...
...гаворыць, якое ў яго складанае жыццё. Як увесь яго план паляцеў да чорта.
Ты лічыш, МОЙ ПЛАН ажыцявіўся?
Лічыш, я выношвала цябе дзевяць месяцаў і карміла сваімі грудзьмі толькі для таго, каб глядзець, як ты становішся АБ'ЕКТАМ УСЕАГУЛЬНАЙ НЯНАВІСЦІ?
Твой бацька забіваў дзеля свайго бізнэса.
ТЫ забіваў дзеля ВЕСЯЛОСЦІ.
Я не магу з'ехаць з Нью-Ёрка, не выканаўшы тое, што абавязана...
...не спакаваўшы цябе ў магілу, дзе табе І МЕСЦА.


ПРАЦА:
Уау, дзяўчына, якую я сустрэў мінулай ноччу зноў твітнула мне. Прапануе заўтра паабедаць разам. Як лічыш, што гэта **азначае**?
Ну ня ведаю. Падазрона нейк. Мабыць, яна злодзец, які хоча заманіць цябе ў пастку. Ці, як у фільме Кэры, выкіне якую-небудзь **крывавую** штуку.
Я спачатку так сама падумаў, але, напэўна, гэта проста параноя. Магчыма ж, што я проста ёй спадабаўся?
Не, гэта не проста параноя. Мы не з тых хлопцаў, якія падабаюцца жанчынам. Тут павінен быць нейкі падвох.
Гэй, хлопцы! Меньш балбытні, больш гатавання.
Хвалюешся з-за сён-няшняга доўгачаканага збору?
Яшчэ як!
ДОЎГАЧАКАНЫ ЗБОР:
Як, **кажаш**, гэтага хлопца завуць?
Роко Джэнавезэ. Найстаршы з братоў, якія ўспадкавалі Нью-Ёрк ад свайго бацькі ў 89-м.
Роко быў бандзюгай з вялікай літары. Калісьці яго баяліся ўсе адшчапенцы горада.
Дык чаму ж мы тады пра яго нічога не чулі?
Бо яго выкрэслілі з кніг гісторыі, калі ён вярнуўся назад у Сіцылію, дзе працаваў у цэну.
Гэты мужык любіць маладых бландынаў і яму ніколі не падабалася ўзначальваць хеўру.


Дык навошта ж ён вярнуўся?
Бо так атрымалася, што Роко да ўсяго іншага з'яўляецца самым жорсткім выблядкам у гісторыі Нью-Ёрка і, улічваючы тое, што Забівашка перарэзала ўсіх астатніх важных асоб, ім стала не хапаць **кіруючых** кадраў.
Яго мянушка на Сіцыліі была Айсберг, бо тыя, хто яму **не падабаўся**, адразу ж атрымлівалі **ледасекам** па чарапушцы.
Ён прыляцеў у Нью-Ёрк **два тыдні назад.** І сутнасць у тым, што ён плануе стварыць супербанду, якая будзе складацца з усіх хеўр на **ўсходнім узбярэжжы**.
І ты хочаш, каб мы **пужанулі** гэтага хлопца?
Чаму б і не? Мы павінны даць ім зразумець, што тое, што Забівашка ў турме, не азначае, што яны могуць **не баяцца** нас.
Я хацеў бы штосьці ўдакладніць - я не збіраюся нікога забіваць! Якой бы апошняй сучарай ён ні быў - я сшыў гэты касцюм не для таго, каб у Дэкстэра гуляць.
Я таксама, чувак. Я хачу з гэтым чуваком згуляць па правілах Бэтмэна. На самой справе - трэба ўсё **зрабіць, як** у «Бэтмэн: Год першы».
Памятаеце той момант, калі ўсе адмарозкі сядзелі і святкавалі, а Бэтмэн узарваў сцяну і вынес ім мазгі **пужаючай прамовай**?
Я падумаў, што мы маглі б паўтарыць гэта з Айсбергам і яго прыяцелямі **на вечарыне ў гонар вызвалення** Крыса Джэнавезэ.



«Толькі ўявіце... Сцяна выбухае, на нас падае святло, і мы ўваходзім праз дым ад сухога льда...»
Спадары і спадарыні, вы нядрэнна насыціліся. Насыціліся дабрабытам і духам Нью-Ёрка, але ваш баль падайшоў да канца.
З гэтага моманту... ніхто з вас не выратуецца.
Уаў, прама як я і марыў. Гэта менавіта тое, што я так адчайна хацеў зрабіць. У нас у наяўнасці хоць ёсць такія рэчы, накшталт сухога льда?
О так. Забівашка і Вялікі татуля выдаткавалі шмат грошаў на абсталяванне для барацьбы са злачыннасцю. У нас тут ёсць такія штукі, якія табе нават і ня сніліся, чалавек-казурка.
Гэта ўсё, канешне, добра, але давайце лепш паспрабуем зрабіць штосьці меньш самазабойчае. Напрыклад, арганізуем паляванне на троляў у інтэрнэце. Я даўно за імі сачу.
Іх сотні і ўсе яны пішуць брудныя рэчы ў адрас зорак. Я падумаў, мы маглі б паведаміць аб іх у **органы сацыяльных сетак**.
Што?


Ну, я не люблю гэта агучваць, але нам усё яшчэ **тэхнічна** забаронена насіць маскі на публіцы, Мардабой. Я ведаю, копы ўжо перасталі рэагаваць на гэта, але яны ўсё роўна могуць арыштаваць нас у любы момант.
Лепш быць арыштаваным, займаючыся **годнай справай**, чувак. Ёсць жадаючыя бароцца з інтэрнэт-тролямі замест Бэтмэна: Год першы?
Маўчанне гаворыць **само за сябе**, Сокавыцiскалка.
Ты ведаў, што **Гітлер** выкарыстоўваў банальны папулізм для кантроля **прыдуркаватых**?
Значыць, я - **шыкоўны** Гітлер. Карацей, мы ў любым выпадку ў суботу вечарам пойдзем на гэту вечарыну. Калі ты штосьці маеш супраць - дзверы там.
Нікуды ісці я **не збіраюся**, Мардабой.
Мне і тут вельмі добра, дзякуй.


ТУРМА:
Блаславі цябе божа, Джоні Джэнавезэ...
...дзякуй, што навучыў мяне таму, што можна насіць зброю калі і дзе заўгодна, калі гэта ў выніку БУДЗЕ МЕЦЬ СЭНС.
БАЛЬНІЧНАЕ КРЫЛО:
Што ты там смотрыш?
Гэта? Ды стары мульт-тсерыял па Людзям-ікс. Я ў дзяцінстве яго любіў. Яго залілі на айцюнс, і я сцягнуў усе сезоны.
Я лічыў, што суперзлодзеі не павінны фанацець па супергероям.
Ну, я ж не заўсёды быў суперзлодзеем. У мяне нават быў касцюм Расамахі, які я заўсёды насіў.
Я распранаў яго толькі для таго, каб аддаць пакаёўцы для прання. Але нават тады я стаяў і чакаў, калі яна мне яго верне.
Я ніколі не хацеў гэтага. Калі я быў дзіцём, я хацеў быць **супергероем**. Не ведаю, чаму ў выніку я кончыў, як гробаны Доктар Дум.
NY D.O.C. JANITOR SVC



Місіс Джэнавезэ.
Пэдра.
Ведаеш, мы з **братам** былі супергероямі. У нас нават была свая каманда. Але спачатку мы працавалі **касталомамі ў бандзе**.
Мы выканалі пару заданняў для **твайго бацькі**. Памятаеш Сэла Берталілі? Але ты, напэўна, ведаеш яго пад імем **Палкоўнік**...
Вось лайно.
Не спрабуй дацягнуцца да **кнопкі выкліка медсястры**, Крыс. Я ўжо адключычў яе....
...і не спрабуй **супраціўляцца**. ты мне нічога не зробіш сваімі слабымі ручкамі.
Раней я часта гэта рабіў, малы. І я вельмі добра майстар у гэтым. Я заблакірую шляхі дотыка кіслароду, пакуль тваё **сэрца** не ўзарвецца. Гэта зойме не больш пары хвілін.


Спадзяюся, табе сапраўды шкада таго, што ты зрабіў з Сэлам, і той дзяўчынкай, і ўсімі людзьмі, якіх ты скалечыў. Мабыць, Бог пашкадуе тваю бессмяротную душу.
Місіс Джэнавезэ.
Іван.
Павінен згадзіцца... Ты даволі вёрткі. Усё яшчэ трымаешся...
8:25
8:25


Якога чорта?
«Ёй спатрэбілася шэсцьдзесят секунд. Гэта было яе адкуплен-не. Ёй спатрэбілася хвіліна, каб выстрэліць».
М-мама?


Якога **хрэна**?
TO BE CONTINUED






ЗОРНЫЯ ВОЙНЫ. ДАРТ ВЭЙДЭР

(MARVEL, 2015)

ужо даступны на www.patreon.com/comicsby

Gillen, Larroca, Delgado. Дзеянне адбываецца пасля падзей «Зорных войн: Эпізод IV: Новая надзея» і першых трох выпускаў комікса «Зорныя войны». Дарт Вэйдэр павінен пакутаваць ад наступстваў яго нядзольнасці спыніць Альянс паўстанцаў падчас бітвы пры Явіне, і адпраўляецца на місію, каб весці перамовы з Джаба Хатам . Тым часам Вэйдэр наймае двух паляўнічых за галовамі, каб схапіць Люка Скайуокера і таямнічага агента Імператара.







ПАДТРЫМАЙ МЯНЕ НА PATREON

www.patreon.com/comicsby

Твая падтрымка дапаможа мне праводзіць больш часу за перакладамі коміксаў, каб у цябе было яшчэ больш літаратуры на беларускай мове.

Выбяры адзін з варыянтаў падтрымкі на patreon:

Афіцыйны патрон

3 $
ЗА МЕСЯЦ

ДАЛУЧЫЦЦА

Афіцыйны патрон атрымлівае спасылку на рэліз перакладa **на 1 месяц раней**, чым падпішчыкі ў сацыяльных сетках.

- На 1 месяц раней, чым усе

Патрон з падпіскай прэміўм

5 $
ЗА МЕСЯЦ

ДАЛУЧЫЦЦА

Патрон з падпіскай прэміўм атрымлівае спасылку на рэліз новых серый **на 1 год раней**, чым падпішчыкі сацыяльных сетак.

Сярод такіх новых серый мы плануем коміксы «Цуда-жанчына», «Дарт Вэйдэр», «Чорны молат», «Дэпартамент праўды» і інш. Спачатку - па 2 выпускі ў месяц, а далей - у залежнасці ад колькасці патронаў з падпіскай прэміўм.

Так сама атрымлівае ўсё тое, што і **Афіцыйныя патроны**.

- На 1 год раней, чым усе
- На 1 месяц раней, чым усе
- Дотык да новых серый коміксаў

Мае мэты:

100 патронаў -
я найму перакладчыкаў, каб было яшчэ больш перакладаў на беларускую мову.

500 патронаў -
я ствару выдавецтва, мэтай якога будзе - электронная публікацыя арыгінальных коміксаў і кніжак на беларускай мове.

1000 патронаў -
выдавецтва пачне друкаваць папяровыя кніжкі і коміксы з творамі на беларускай мове, якія можна будзе набыць у беларускіх крамах.